# ПОСТАЦІ, ПРАБЛЕМЫ, ПЕРСПЕКТЫВЫ

**5 мая, у Дзень друку адбылася чарговая сустрэча пісьменнікаў горада над Нёманам са студэнтамі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. У фармаце брыфінг-дыялогу з моладдзю свой мастацкі дыяпазон прадэманстравалі сучасныя літаратары, якія працуюць у розных творчых амплуа.**

У гасцях у студэнтаў-купалаўцаў выступілі члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэсы Вольга Алізар і Людміла Шаўчэнка; паэтэса, празаік Таццяна Лашук; краязнавец, публіцыст Аляксандр Сявенка; паэт, публіцыст, літаратурны крытык Дзмітрый Радзівончык. Мерапрыемства з удзелам запрошаных гасцей у межах лекцыйных заняткаў па тэме «Сучасны літаратурны працэс. Літаратурная Гродзеншчына: постаці, праблемы, перспектывы» адбылося для студэнтаў 2 курса спецыяльнасцей «Інфармацыя і камунікацыя» і «Журналістыка» (факультэт гісторыі, камунікацыі і турызму). Ініцыятар – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, літаратуразнаўца, літаратурны крытык, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь (намінацыя «Найлепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства»), член СПБ Аліна Сабуць. Аліна Эдмундаўна таксама выканала ролю мадэратара сустрэчы. Брыфінг-дыялог, які доўжыўся амаль тры гадзіны, стаў сапраўдным марафонам для прыхільнікаў друкаванага слова, мастацкага і дакументальнага. Нягледзячы на прафесійнае свята, Дзень друку, атмасфера ўва ўніверсітэцкай аўдыторыі склалася рабочая. Гутарка пісьменнікаў са студэнтамі атрымалася сур’ёзнай, вельмі давернай, поўнай унікальнай інфармацыі, каштоўных ведаў, шчырых эмоцый і сяброўскага цяпла.



Пасля ўступнага слова з аглядам дзейнасці Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі сваіх калег па дэлегацыі прадставіў Дзмітрый Радзівончык. Прагучалі пытанні будучых майстроў пяра. Яны тычыліся найбольш распаўсюджаных жанраў у творчасці гасцей, асаблівасцей сучаснай айчыннай публіцыстыкі, ролі чытача і СМІ, уплыву літаратурнай крытыкі на творчы працэс і шмат чаго яшчэ. Трэба адзначыць, што пытанні адлюстравалі багаты спектр інтарэсаў пішучай моладзі. Дарэчы, Аліна Эдмундаўна прапанавала студэнтам у пісьмовай форме прадставіць свае рэфлексіі ад сустрэчы з гасцямі. А госці прапанавалі апублікаваць найбольш удалыя працы на сваім пісьменніцкім сайце.



Але і адказы нікога не расчаравалі. Тым больш, што яны былі праілюстраваны, дапоўнены аўтарскімі творамі. Аляксандр Сявенка распавёў аб ідэйна-тэматычнай разнастайнасці сваёй публіцыстыкі, пералічыў напрамкі даследчай працы, падрабязна спыніўся на працэсе ўласнай адукацыі (у Аляксандра Віктаравіча за плячыма тры вышэйшыя адукацыі і аспірантура, фактычна гэты чалавек стаў увасабленнем ведаў), рассказаў пра сваіх настаўнікаў і, вядома, пра герояў сваіх публікацый. Студэнты спрабавалі зразумець, *што* ім варта чакаць у будучым ад «гэтых пісьменнікаў», якія ж яны – узаемаадносіны літаратараў і журналістаў… А Аляксандр Віктаравіч Сявенка ўсё працягваў інтрыгаваць цікавымі фактамі з гісторыі Прынёманскага краю, з гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Гучалі імёны літаратараў мінулых стагоддзяў: Ян Чачот, Тэадор Нарбут; ветэран Вялікай Айчыннай, легендарны Аляксей Карпюк… «Сучасны публіцыст заўсёды ў дарозе. Дзе толькі мне ні даводзілася пабываць – у Расіі і Еўропе, у



Сярэдняй Азіі, на Каўказе і на шматпакутным Данбасе..., – працягваў пісьменнік, ваенны журналіст, – А яшчэ будзьце гатовыя аддавацца прафесіі да канца, працаваць, што называецца, на ўсю катушку. Таму што ад сучаснага журналіста, акрамя працы з тэкстам, патрабуецца ўменне фатаграфаваць, апрацоўваць фотаматэрыялы, аператыўна збіраць і публікаваць інфармацыю, а таксама нямала іншых здольнасцяў…». А яшчэ Аляксандр Віктаравіч Сявенка *(на фота)* – вядомы калекцыянер. Госць прадэманстраваў некалькі экзэмпляраў старадаўніх кніг з уласнай калекцыі; выданні датуюцца першай паловай XIX стагоддзя…

Лаўрэат Абласнога літаратурнага конкурсу імя М. Багдановіча Таццяна Лашук пагутарыла з гаспадарамі на тэму цвёрдых жанравых форм паэзіі. «Як празаіку, мне хочацца складаць вершы па законах прозы. Гэта дазваляюць жанры усходняй лірыкі – хоку і хайку». У аўтарскім прачытанні прагучалі экзатычныя для нашага вуха вершы, якія патрабуюць ад чытача здольнасці асацыятыўнага мыслення. Таксама прагучала імя вядомага класіка ўсходняй паэзіі Мацуа Басё. …Вольга Алізар пазнаёміла прысутных з уласнай творчай біяграфіяй і таксама прачытала некалькі твораў, якія назвала прыкладамі жаночай лірыкі. …Людміла Шаўчэнка расказала пра этапы свайго творчага станаўлення, якія былі звязаны са значнымі падзеямі ў жыцці паэтэсы. Прагучалі вершы ваенна-патрыятычнай тэматыкі.

Дзмітрый Радзівончык пазнаёміў студэнтаў з напрамкамі ўласнай творчай дзейнасці – паэзіяй, паэтычнымі перакладамі, літаратурнай крытыкай; зрабіў прэзентацыі некаторых

персанальных і калектыўных выданняў, запрасіў моладзь на старонкі айчынных літаратурных часопісаў і газеты творчай інэлігенцыі Беларусі «Літаратура і мастацтва», на афіцыйны Інтэрнэт-сайт ГрАА СПБ. Закраналася праблематыка мастацкай камунікацыі і творчага ладу жыцця. У прамовах гучалі і балючыя ноткі шматлікіх праблем, якія застаюцца нявырашанымі. Напрыклад недахоп інфармацыі, нізкі ўзровень культуралагічных кампетэнцый, дысгармонія ўва ўзаемаадносінах са СМІ, са сферай адукацыі, недастатковы ўзровень прысутнасці на старонках школьных падручнікаў і іншыя. Але гэта зусім не азначае, што ў надзённых праблем няма шляхоў вырашэння. Шукаць іх было прапанавана сумеснымі намаганнямі. Невыпадкова ў назве нашай пісьменніцкай арганізацыі на першым месцы стаіць слова «Саюз».

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

**На фота:** у Купалаўскі ўніверсітэт завіталі прадстаўнікі ГрАА СПБ: Вольга Алізар, Людміла Шаўчэнка, Таццяна Лашук, Аляксандр Сявенка, Дзмітрый Радзівончык. Ініцыятар брыфінг-дыялогу «Сучасны літаратурны працэс. Літаратурная Гродзеншчына: постаці, праблемы, перспектывы» – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, літаратуразнаўца, літаратурны крытык, член СПБ Аліна Сабуць. Факультэт гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ імя Янкі Купалы, 5 мая 2026 года.



У складзе дэлегацыі ГрАА СПБ на журфаку ГрДУ імя Янкі Купалы выступае публіцыст Аляксандр Сявенка



З уласным пытаннем да гасцей звярнуўся малады журналіст Арсень Шыцік




Выступае Дзмітрый Радзівончык



Выступае паэтэса Вольга Алізар





Выступае празаік, паэтэса Таццяна Лашук



Аляксандр Сявенка, Людміла Шаўчэнка, Дзмітрый Радзівончык, а таксама некаторыя кнігі




MCMXL
ГРОДЗЕНСКІ
ДЗЯРЖАЎНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ